# Якой быць «Ленінцы»?

**Ваша газета не так даўно пісала, як у Ленінскай бібліятэцы гінуць кнігі, наогул, пра яе цяжкае становішча. Адкажыце, калі ласка, ці намеціліся ў лёсе буйнейшай бібліятэкі рэспублікі якія-небудзь пазітыўныя зрухі?**

**І. ФЕДЗІН,**
**г. Барысаў.**

Толькі што падведзены вынікі конкурсу на праект новага будынка бібліятэкі імя У. І. Леніна, які праводзілі Міністэрства культуры БССР, Дзяржбуд БССР, Мінгарвыканком і Саюз архітэктараў БССР.

Як паведаміў сакратар журы конкурсу, загадчык аддзела ГалоўАПУ І. Чаравікаў, у конкурсе прымалі ўдзел аўтары сямі праектаў пяці інстытутаў — трох беларускіх («Мінскпраект», «Белдзяржпраект», «Брэстграмадзянпраект») і двух маскоўскіх («Гіпратэатр» і Цэнтральны навукова-даследчы інстытут эксперыментальнага праектавання імя Б. С. Мезенцава).

Пераможцам, які набраў 22 ачкі і атрымаў першую прэмію ў размеры 5.000 рублёў, стаў праект архітэктараў інстытута «Мінскпраект» Міхаіла Кліменцьевіча Вінаградава і Віктара Уладзіміравіча Крамарэнкі.

— Гэты праект адразу пакарыў усіх удалай тэхналогіяй,— гаворыць дырэктар бібліятэкі **А. Міхаленя.** — У ім самы дасканалы бібліятэчны тэхналагічны працэс — самыя кароткія адлегласці ад сховішчаў да чытальных залаў. Некаторыя іншыя былі знешне, можа, і больш прывабныя, але кнігі там былі б асуджаны на доўгія марудныя падарожжы, а чытач— на марнаванне часу. А тут вырашана галоўная задача — звязаць складаную тэхналогію з архітэктурай.

Месца для новага будынка бібліятэкі выбрана ў канцы Ленінскага праспекта ля станцыі метро «Усход». Упэўнены, што ён там будзе выглядаць вельмі эфектна.

**— Колькі часу зойме будаўніцтва?**

— Аўтары-пераможцы толькі пачалі рабіць рабочую дакументацыю. На гэта пойдзе два гады, а ў 1993 годзе будаўніцтва будзе распачата. Здаць новую бібліятэку ў эксплуатацыю плануецца ў 1997 годзе. Урадам рэспублікі гэтай справе ўдзяляецца вялікая ўвага, таму ёсць падставы спадзявацца, што тэрміны будуць вытрыманы.

**— А што сёння робіцца, каб уратаваць кнігі ад патопаў? Многія з іх сем гадоў проста не «працягнуць».**

— Сёння нам перададзены будынак Кастрычніцкага райкома партыі карыснай плошчай 1.200 квадратных метраў і будынак былога вучылішча металістаў на Партызанскім праспекце плошчай 1.800 метраў. Пасля рэканструкцыі туды будуць перавезены 600.000 кніг з падвалаў бібліятэкі. Праз сем гадоў мы гэтыя памяшканні, вядома, вызвалім. А ў цяперашнім галоўным будынку будзе размешчана альбо рэспубліканская дзіцячая бібліятэка, альбо беларускі аддзел нашай — гэта пытанне яшчэ будзе вырашацца.



**На здымку: праект-пераможца.**